ВЕСЦІ НАЦЫЯНАЛЬНАЙ АКАДЭМІІ НАВУК БЕЛАРУСІ № 3 1998
СЕРЫЯ ГУМАНІТАРНЫХ НАВУК

*УДК 329.1/.6(476)*

*М. М. ЗАБАЎСКІ*

# ПАЛІТЫЧНЫЯ ПАЗІЦЫІ ДЭПУТАТАЎ АД БЕЛАРУСКІХ ГУБЕРНЯЎ У IV ДЗЯРЖАЎНАЙ ДУМЕ РАСІІ

Ход выбараў у Расійскую Дзяржаўную думу IV склікання ў заходніх губернях, адносіны дэпутатаў ад Беларусі да самадзяржаўя і важнейшых пытанняў палітычнага жыцця краіны ў беларускай гістарыяграфіі не асветлены.

У Расійскай імперыі Дзяржаўная дума склікалася чатыры разы. I Дума праіснавала амаль тры месяцы — з 27 красавіка па 8 ліпеня 1906 г. (была праведзена адна сесія). II Дума працавала з 20 лютага па 2 чэрвеня 1907 г. (адна сесія). III Дзяржаўная дума дзейнічала больш чатырох гадоў і сямі месяцаў — з 1 лістапада 1907 да 9 чэрвеня 1912 г. (пяць сесій).

З верасня па кастрычнік 1912 г. ва ўмовах пільнага адміністрацыйнага нагляду прайшлі выбары ў IV Дзяржаўную думу. Уся выбарчая кампанія адбывалася пад сцягам імкнення ўлады ўзмацніць становішча дваранства. Яму належала заняць дамінуючае становішча ў Думе і наогул у палітычным жыцці краіны. У разасланых па ўсіх губернях цыркулярах за подпісам міністра ўнутраных спраў А. А. Макарава ўказвалася весці выбарчую справу ў саюзе і згодзе з дваранствам, а таксама прыцягваць праваслаўнае духавенства.

Ад Віленскай губерні дэпутатамі былі абраны: таварыш пракурора віленскага акруговага суда, манархіст Г. Г. Замыслоўскі; святар Гальшанскай царквы, член "Саюза рускага народа" У. П. Юзьвюк; землеўладальнік, паляк В. І. Банькоўскі; законавучыцель у рэальным вучылішчы і жаночай гімназіі ў Вільні, паляк С. Г. Мацаевіч; член віленскага сельскагаспадарчага таварыства, член II Думы, граф, паляк Л. С. Путкамер; інжынер чыгункі, паляк Г. І. Свянціцкі; заможны селянін Свянцянскага павета М. Я. Цывунеліс.

У Гродзенскай губерні ў IV Думу прайшлі: селянін П. Дз. Пясляк; буйны землеўладальнік, былы гродзенскі віцэ-губернатар А. А. Азнобішын; павятовы прадвадзіцель дваранства П. А. Сафонаў; член Гродзенскага акруговага суда, прагрэсіст Ф. І. Лашкейт; протаіерэй, настаяцель Гродзенскага сабора Я. І. Грышкоўскі; валасны старшыня, правы Ц. Я. Тарасевіч; селянін В. І. Сідарук.

Губернскі выбарчы сход Віцебскай губерні ў Думу накіраваў: селяніна А. І. Мухіна; гласнага губернскага і павятовага земства М. М. Яўрэінава; дрысенскага павятовага прадвадзіцеля дваранства І. Ф. Полаўцава; настаўніка пачатковага вучылішча С. Р. Кірылава; святара царквы сяла Хвашына І. А. Альхоўскага, гласнага Віцебскага губернскага земскага сходу П. М. Шмякава.

Ад Мінскай губерні дэпутатамі сталі: селянін І. Ф. Малайчук; мазырскі павятовы прадвадзіцель дваранства С. М. Сорнеў; буйны землеўладальнік Бабруйскага павета Р. А. Лашкароў; настаяцель Віленскай Знаменскай царквы К. М. Акаловіч; дэпутат II і III Дум В. А. Якубовіч; землеўладальнік Пінскага павета А. Л. Фоцінскі, пінскі павятовы прадвадзіцель дваранства І. А. Папа-Афанасапула; селянін Слуцкага павета, павятовы земскі гласны С. Д. Вярбіла і селянін в. Бабічы Рэчыцкага павета К. А. Смяян.

У Магілёўскай губерні думскімі дэпутатамі былі абраны: земскі гласны М. Р. Вараб'ёў; буйны землеўладальнік А. А. Радкевіч; гласны гарадской думы г. Магілёва

В. С. Бычкоў; старшыня Рагачоўскай павятовай земскай управы В. С. Дрыбінцаў; член Дзяржаўнай думы III склікання, землеўладальнік М. М. Ладамірскі, выкладчык арыфметыкі і фізікі Магілёўскай цэнтральнай фельчарскай школы К. Ф. Тамашэвіч; буйны землеўладальнік Б. А. Энгельгард [1].

Дзяржаўная дума IV склікання пачала работу 15 лістапада 1912 г.

Як і ў III Думе, у IV царызму ўдалося захаваць дзве большасці: праваакцябрысцкую (283 галасы) і акцябрысцка-кадэцкую (226 галасоў). З 442 дэпутатаў рускіх нацыяналістаў і памяркоўна-правых было 120, акцябрыстаў — 98, правых — 65, кадэтаў — 59, прагрэсістаў — 48. Тры нацыянальныя групы (польска-літоўска-беларуская група, Польскае кола, мусульманская група) налічвалі 21 дэпутата, сацыял-дэмакраты — 14 (бальшавікі — 6, меншавікі — 7, прымкнуўшыя да меншавікоў — 1), трудавікі — 10, беспартыйныя — 7 [2].

Адным з важных вынікаў выбараў з'явілася рэзкае аслабленне акцябрыстаў, і гэта не было выпадкова: палітыка А. І. Гучкова ў III Думе, якая грунтавалася на дагаджэнні П. А. Сталыпіну і нацыяналістам, выклікала расчараванне не толькі ў колах акцябрысцкіх выбаршчыкаў, але і ва ўласнай партыі. Разам з тым павялічылася колькасць "прагрэсістаў", што азначала збліжэнне "левага" акцябрызму і правых кадэтаў. І тым не менш акцябрысты захавалі ў Думе ролю "цэнтра".

Дэпутаты ад 5 заходніх губерняў паводле партыйных груповак размеркаваліся ў Думе наступным чынам. Фракцыю правых склалі Г. Г. Замыслоўскі, У. П. Юзьвюк, К. М. Акаловіч, В. А. Якубовіч. Дэпутаты П. Д. Пясляк, А. А. Азнобішын, П. А. Сафонаў, Я. І. Грышкоўскі, Ц. Я. Тарасевіч, В. Ф. Сідарук, А. І. Мухін, І. Ф. Полаўцаў, С. Р. Кірылаў, Ф. І. Альхоўскі, П. М. Шмякоў, І. Ф. Малайчук, С. М. Сорнеў, Р. А. Лашкароў, А. П. Фоцінскі, І. А. Папа-Афанасапула, К. А. Смяян, М. Р. Вараб'ёў, А. А. Радкевіч, В. С. Бычкоў, К. Ф. Тамашэвіч, С. Д. Вярбіла, М. М. Ладамірскі далучыліся да фракцыі рускіх нацыяналістаў і памяркоўна-правых. У фракцыю цэнтра ўвайшлі М. М. Яўрэінаў і Б. А. Энгельгардт. В. С. Дрыбінцаў выступаў як прадстаўнік "Саюза 17 кастрычніка". Польскія памешчыкі і каталіцкае духавенства ад Віленскай губерні В. І. Банькоўскі, С. Г. Мацаевіч, Л. С. Путкамер, Г. І. Свянціцкі, М. Я. Цывунеліс, як і ў III Думе, стварылі Польска-літоўска-беларускую групу. Да іх далучыўся прадстаўнік Ковенскай губерні Ф. Ф. Рачкоўскі. У фракцыю прагрэсістаў увайшоў Ф. І. Лашкейт.

Акцябрысцка-кадэцкай большасцю (251) галасоў супраць правых і нацыяналістаў (150) старшынёй Думы быў абраны М. У. Радзянка.

З першых жа сустрэч урада і дэпутатаў IV Дзяржаўнай думы было відавочным узмацненне супярэчнасцяў трэцячэрвеньскай сістэмы. Царызм знаходзіўся ў складаным унутрыпалітычным і міжнародным становішчы. Калі ўнутры краіны ўсё выразней праяўляліся сімптомы агульнанацыянальнага крызісу, то ў міжнародных адносінах увага кіруючых колаў усё больш канцэнтравалася на падрыхтоўцы да вайны. Нягледзячы на значныя супярэчнасці з Англіяй і Францыяй, царызм усё больш уцягваўся ў антыгерманскую кааліцыю ў сувязі з развіццём падзей на Балканах. Балканская вайна зрабіла вялікі ўплыў і на ўнутрыпалітычную расстаноўку сіл у Расіі [3]. Амаль усё права-акцябрысцкае і большая частка ліберальнага "грамадства" патрабавалі ад урада актыўнай падтрымкі балканскіх краін у барацьбе супраць Турцыі і Аўстрыі. І толькі кадэцкае кіраўніцтва на чале з П. М. Мілюковым заклікала да стрыманасці ў знешняй палітыцы, разумеючы, што Расія да вайны не падрыхтавана, а галоўнае, каб хваля нацыяналізму не прывяла да ўзмацнення ўплыву правых і аслаблення апазіцыі.

Спрэчкі па пытаннях знешняй палітыкі ўскладнялі рознагалоссі па галоўнай праблеме, якая паўстала перад царызмам і заможнымі саслоўямі, — аб шляхах прадухілення рэвалюцыі. Прынцыпова змяніцца пазіцыі прыхільнікаў сталыпінскага банапартызму і ліберальнай апазіцыі не маглі, а вастрыню супярэчнасці ў краіне ўзмацнялі рознагалоссі паміж гэтымі палітычнымі плынямі і ўнутры іх, выклікаючы ў Думе і грамадстве тупіковую сітуацыю.

Сведчаннем патавай сітуацыі ўрада з'явілася дэкларацыя, з якой 5 снежня 1912 г. у Думе выступіў прэм'ер-міністр і міністр фінансаў краіны У. М. Какоўцаў. Дэкларацыя адлюстроўвала імкненні пазбегнуць дакладна вызначанага ўрадавага курсу пры агульным далейшым скіраванні ўправа. Прэм'ер-міністр адзначыў, што дзейнасць Думы павінна быць накіравана на пошукі шляхоў па ажыццяўленні Маніфеста ад 17 кастрычніка, але тут жа патрабаваў ахоўваць інтарэсы рускай дзяржаўнасці — "адзінства і непадзельнасць імперыі, першынство ў ей рускай народнасці і веру праваслаўную". Далей ішоў пералік законапраектаў, зведзеных у восем раздзелаў.

Галоўным пунктам абвінавачванняў урада з боку Думы была адсутнасць праграмы дзеянняў. "Мы патрабуем дакладна акрэсленай праграмы, — заяўляў У. М. Пурышкевіч, — што ўмацавала б значэнне нашых дэвізаў і тую самадзяржаўную ўладу, якую імкнуцца падарваць левыя фракцыі... Нам агідна гэтая хісткасць урадавай улады, нездольнасць яе прама заявіць, чаго яна жадае". "Праграма У. М. Какоўцава, — працягваў прамоўца, — гэта не пуцяводная зорка рускай дзяржаўнасці, а млечны шлях, туманнасць". Далей, як і ў трэцячэрвеньскі перыяд, ішлі патрабаванні ўтаймаваць "іншародцаў", звярнуць увагу на друк, на становішча царкоўна-прыходскіх школ. Змест прамовы У. М. Пурышкевіча быў накіраваны непасрэдна супраць У. М. Какоўцава, і дэпутат не ўтойваў, што правыя хацелі б бачыць на пасадзе прэм'ера чалавека, які адкрыта абраў бы правы курс. У такім жа агрэсіўна-наступальным духу пачаў сваё першае выступленне ў IV Дзяржаўнай думе Г. Г. Замыслоўскі. Ён указаў на "адсутнасць цвёрдай улады, на вузкую, чыста казначэйскую ўрадавую палітыку, што грунтавалася на спойванні народа, а не на шырокай эканамічнай праграме" [4, стб. 267].

Мінскі епархіяльны місіянер К. М. Акаловіч не пагадзіўся з прэм'ер-міністрам у тым, што "...пад ценем рускага двухгаловага арла дастаткова прасторы для спакойнага жыцця народаў, якія насяляюць Расію", указаўшы на вялікую небяспеку з боку палякаў, якія сістэматычна захопліваюць у заходніх губернях лясы і зямлю, і яўрэяў, што ў сваіх руках трымаюць і капітал, і гандаль, і друк. К. М. Акаловіч адзначыў: "Жыццё праваслаўнага чалавека тут немагчыма. Нават цвёрдыя ў веры стараверы пакідаюць у краі землі і едуць у Сібір, каб не бачыць сыходзячай крывёю сваю жывёлу, якая вяртаецца з палёў з адкручанымі хвастамі і выразанымі на скуры чатырохканцовымі польскімі крыжамі". Заклікаючы ўрад да рашучых дзеянняў супраць палякаў і яўрэяў у заходнім краі, святар заявіў: "... Мы не можам далей жыць і чуць песню "Яшчэ Польшча не згінэла і не згіне, яшчэ москаль у паляка будзе пасвіць свінэ" [4, стб. 880—884].

Па сутнасці ўсе прадстаўнікі фракцыі правых, якія выступалі на пачатку працы IV Думы, падкрэслівалі, што шлях, абраны ўрадам, шлях думскага і канстытуцыйнага развіцця непазбежна прывядзе да гібелі манархіі. Разглагольствуючы пра рэвалюцыі, правыя па-ранейшаму не разумелі прычыны, што выклікалі яе, і абвінавачвалі ў падбухторванні да рэвалюцыйных выступленняў кадэтаў і мірнаабнаўленцаў. З гэтага вынікала нязменная праграма крайне правых: ніякіх уступак "апазіцыйна-інтэлігентным" партыям, якія не могуць "стрымаць народныя хвалі, імі ж і ўзнятыя" [4, стб. 941]; барацьба з імі з дапамогай паліцэйскага вышуку і адкрытага тэрору; выкарыстанне магчымасцей, для таго каб забраць назад усё, што было адваявана ў царызму ў 1905 г.

Так, "истинно-русские" з "Виленского вестника", падводзячы вынікі дзейнасці апазіцыі на пачатку працы IV Думы, галоўную небяспеку бачылі у дзейнасці кадэтаў, "...якія прыцягваюць на свой бок акцябрыстаў, дзеля стварэння левай большасці" [5]. Крытыцы падвергі ўрадавую дэкларацыю рускія нацыяналісты. Яны былі незадаволены прэм'ер-міністрам за недастатковую, з іх пункту гледжання, актыўнасць у наступленні на "іншародцаў" і за Балканскі крызіс. Галоўная прэтэнзія заключалася ў тым, што ўрад не працягваў палітычнага курсу П. А. Сталыпіна.

Аднак, патрабуючы цвердага курсу і моцнага лідэра, нацыяналісты выступалі

за захаванне заканадаўчай Думы. Яны заяўлялі, што "... ні ў дэкларацыі, ні ў дзеяннях урада няма выразнасці, няма ніякага руху ні наперад, ні назад, ёсць толькі таптанне на месцы. А з усіх палітычных курсаў самым небяспечным з'яўляецца наогул адсутнасць палітычнага курсу" [4, стб. 420—427]. "Мы, нацыяналісты, — адзначыў у кароткай прамове магілёўскі памешчык А. А. Радкевіч, — з'яўляемся перакананымі прыхільнікамі народнага прадстаўніцтва, і ў гэтым сэнсе мы пойдзем поплеч з усімі разумнымі патрыятычнымі элементамі Дзяржаўнай думы" [4, стб. 440—444]. Пад "разумнымі патрыятычнымі элементамі" нацыяналісты падразумявалі перш за ўсё акцябрыстаў.

Правал палітыкі "супакаення і рэформ" выклікаў узмацненне ліберальнай апазіцыйнасці. Нават акцябрысты загаварылі ў Думе пра недасканаласць урадавай палітыкі і адсутнасць аўтарытэту ўлады. У гэтай сувязі думскія акцябрысты ўвесь час успаміналі П. А. Сталыпіна і гаварылі пра тое, што П. А. Сталыпін не дапусціў бы такога становішча, у якім апынулася дзяржава пры яго пераемніках. Лідэры партыі разлічвалі, што для прадухілення рэвалюцыі дастаткова "прымірэння культурных пластоў рускага насельніцтва" [4, стб. 468].

У 1912 г. утварылася новая ліберальная партыя прагрэсістаў, у склад якой увайшлі пераважна прадстаўнікі гандлёва-прамысловых колаў. Напружанасць ліберальнай апазіцыйнасці значна ўзрасла. Праграмай партыі прадугледжвалася "ўсталяванне канстытуцыйна-манархічнага ладу з адказнасцю міністраў перад народным прадстаўніцтвам", расшырэнне выбарчага права і кампетэнцыі Думы, рэфармаванне Дзяржаўнага Савета, адмена выключных законаў і ўвядзенне грамадзянскіх свабод [6]. Ад кадэцкай прагрэсісцкую праграму адрознівала нявызначанасць у пытаннях аб раўнапраўі нацыянальнасцей. Лідэры прагрэсістаў М. І. Львоў, А. І. Канавалаў крытыкавалі ўрадавую дэкларацыю за недакладнасць і нявызначанасць палітычнага і эканамічнага курсаў. Прадстаўнік Гродзеншчыны, адзіны прагрэсіст у Думе ад беларускіх губерняў Ф. І. Лашкейт, гаварыў пра немагчымасць росквіту вытворчых сіл "у рамках паліцэйскага ладу" [4, стб. 904]. Між тым большасць прагрэсістаў разлічвала на У. М. Какоўцава ды імкнулася да супрацоўніцтва з ім. Іх орган друку — газета "Утро России" лічыла прэм'ер-міністра "надзейным тормазам" супраць рэакцыі і пераконвала У. М. Какоўцава ў тым, што, калі ён адчуе сябе "дастаткова моцным і надзеленым дастатковай паўнатой улады" для здзяйснення абяцанняў Маніфеста ад 17 кастрычніка, "па гэтаму шырокаму шляху і ўрад, і народ пайшлі б поплеч" [7]. Яшчэ больш актыўна, чым у перыяд III Думы, паявілі сябе кадэты. Іх прадстаўнікі ў "парламенце" ўнеслі некалькі законапраектаў аб "свабодах" (саюзаў, сходаў) і ў тым ліку законапраект аб усеагульным выбарчым праве. Адносіны да ўрадавага курсу кадэцкая "Речь" вызначыла наступным чынам: "...дэкларацыя У. М. Какоўцава сустрэла ў Думе халодны прыём і нікога не задаволіла" [8].

У Думе выступілі В. А. Маклакоў і П. Н. Мілюкоў. Апошні адзначыў, што дэкларацыя У. Н. Какоўцава наогул не дэкларацыя, а "заканадаўчы патоп", у якім перамешаны ліберальныя і рэакцыйныя мэты і праекты. Каб прывесці Расію да міру і спакою, каб ажыццявіць патрабаванні народных мас, на думку П. Н. Мілюкова, неабходна было скасаваць выбарчы закон ад 3 чэрвеня і ліквідаваць Дзяржаўны Савет у яго тагачасным выглядзе і ўрад, не адказны перад Думай [4, стб. 601, 602, 606]. "Няхай улады, — закончыў сваю прамову П. Н. Мілюкоў, — стануць надзейным слугою Маніфеста 17 кастрычніка... і на гэтым шляху... магчыма нарэшце іх прымірэнне з народам".

З чаго зыходзілі прагрэсісты, і асабліва кадэты, якія разлічвалі, што ўрад усё ж вернецца да абяцаных у маніфесце пазіцый менавіта ў перыяд IV Думы? Звыклыя разглядаць палітычную сітуацыю ў краіне скрозь прызму расстаноўкі сіл у Думе, кадэцкія лідэры зрабілі з адсутнасці ў ёй устойлівай большасці выснову, што краіна перажывае "пераходны момант", які не можа быць працяглым. Пры гэтым сам вынік выбараў разглядаўся як правал планаў забеспячэння чыста правай большасці,

а нежаданне прэм'ера салідарызавацца з крайне правымі — як прыкмета таго, што "вера ў стары парадак аджыла... у саміх абаронцаў гэтага парадку" [9].

Неадназначнымі былі адносіны да Маніфеста 17 кастрычніка і для палякаў з польска-літоўска-беларускай групы. Віленскі дэпутат М. С. Путкамер у даволі карэктнай форме дазволіў сабе не пагадзіцца з міністрам унутраных спраў і Сенатам наконт неабходнасці забароны (у снежні 1912 г.) дзейнасці існаваўшых на Віленшчыне таварыстваў узаемадапамогі, рымска-каталіцкіх таварыстваў дапамогі бедным і інш. Затым граф нагадаў ураду, што на Віленшчыне яшчэ не ўведзена земскае самакіраванне. Ён заявіў таксама, што "...старшыня савета міністраў меў мужнасць гаварыць шмат аб чым у сваёй дэкларацыі, але мужнасці сказаць аб тым, што ў адносінах да палякаў не прымяняецца воля манарха, выяўленая ў словах Маніфеста ад 17 кастрычніка, ён не меў". "Мы, палякі, — гаварыў пакрыўджаны М. С. Путкамер, — перажываем саракагоддзе мураўёўскага рэжыму, перажываем і эпоху, у якую ў адносінах да нас найвышэйшыя маніфесты не прымяняюцца" [4, стб. 841—844].

М. А. Янушкевіч, які выступаў з дэкларацыяй трудавой групы, патрабаваў адмены зямельнага закона ад 14 ліпеня 1910 г., свабоды саюзаў і стачак. Аднак галоўную ўвагу прамоўца сканцэнтраваў на сутнасці ўрадавай нацыянальнай палітыкі ў заходніх губернях. Нагадаўшы, што асновы гэтай палітыкі былі закладзены М. А. Мураўёвым, затым П. А. Сталыпіным, М. А. Янушкевіч адзначыў, што "галоўная мэта ўрадавай нацыянальнай палітыкі — абрусенне, і яго ахвярамі з'яўляюцца народы Заходняга краю... палітыка накіравана на тое, каб знішчыць нацыянальную самабытнасць народа, яго культурную творчасць". "Чаму ўрад так абыходзіцца з гэтым народам? — ставіў пытанне дэпутат. — Таму, што яго дваранства даўно апалячылася, адышло ад народа, стала чужым, і таму, што стала нараджацца інтэлігенцыя, якая павінна ўказаць народу яго дэмакратычныя ідэалы. І, безумоўна, урад будзе біць па гэтай інтэлігенцыі". Прамоўца-трудавік патрабаваў, каб "...усе народы Расіі атрымалі права поўнага нацыянальнага самакіравання" [4, стб. 754—760].

З першых пасяджэнняў да трудавікоў далучыўся і прадстаўнік Гродзеншчыны, селянін П. Д. Пясляк, які прайшоў у Думу як рускі нацыяналіст. Ён меркаваў, што трудавікі — гэта тыя, хто працуе. Апазіцыйная газета "Наше утро" (г. Вільня) не пакінула без увагі гэты крыўдны для правых факт і прысвяціла ўчынку П. Д. Песляка вялікі артыкул. Але як толькі дэпутат пазнаёміўся з калегамі па новай партыі і даведаўся, што трудавікі нічога не маюць супраць рассялення яўрэяў па вёсках, ён "перакінуўся" да правых. Ухваляючы свайго земляка, "Северно-западная жизнь" тлумачыла яго паводзіны тым, што сяляне наогул не могуць далучыцца да левых партый па прычыне станоўчых адносін апошніх да яўрэяў. "Пакуль рускі прагрэс не вызваліцца ад яўрэйскага ўплыву і не стане сапраўды рускім, ён не можа разлічваць на падтрымку з боку сялян, і нашы сяляне ў левыя партыі не пойдуць!" — пісала газета [10]. Супраць рысы яўрэйскай аседласці ў Беларусі выступаў і павятовы земскі гласны са Случчыны С. Д. Вярбіла, які ў зямельнай справе лічыў сябе трудавіком. Па сутнасці С. Д. Вярбіла быў адзіным дэпутатам ад беларускіх губерняў у IV Думе, на якога ўскладалі надзеі сялянскія выбаршчыкі Міншчыны. На пытанне карэспандэнта, да якой нацыі С. Д. Вярбіла належыць, ён адказаў: "Да беларускай, бо маю на думцы ўсе сілы аддаць роднаму краю" [11]. У той жа час дэпутат не ўскладаў вялікіх спадзяванняў на IV Думу і лічыў, што лёс яе будзе такі ж, як лёс II Дзяржаўнай думы.

Такім чынам, выступіўшыя на першых пасяджэннях дэпутаты ад беларускіх губерняў, за выключэннем палякаў ад Віленшчыны і селяніна С. Д. Вярбілы, цвёрда сталі на пазіцыі правых і нацыяналістаў. Яны крытыкавалі ўрад за адсутнасць ярка акрэсленай праграмы дзеянняў, заклікалі да рашучых мер у барацьбе з палякамі і яўрэямі ў Заходнім краі. Сапраўдных абаронцаў сацыяльных і нацыянальных правоў беларускага народа ў IV Думе не было. Падаваў надзеі на гэта толькі дэпутат са Случчыны С. Д. Вярбіла.

У карэспандэнцыі з Міншчыны Цішка Гартны (З. Жылуновіч) пісаў у "Нашу

ніву", што ў IV Дзяржаўнай думе "... усе народы маюць сваіх прадстаўнікоў, якія змагаюцца за правы сваёй нацыі. А наша Беларусь пасылае ў Думу толькі чарнасоценных дэпутатаў. Паўловічы ды Юрашкевічы, выступаючы ад беларускіх губерняў, толькі робяць шкоду і крыўду ўсім жыхарам сваімі чалавеканенавісніцкімі прамовамі, другія ж увесь час прасядзяць, слова не вымавіўшы" [11].

Рэдакцыя "Нашай нівы" па-ранейшаму ўскладала надзеі на Думу, якая мусіла "расчысціць тую дарогу, на якую рвалася ўся культурная Расія". Але на гэтым шляху, як адзначала газета, знаходзяцца правыя, акцябрысты і нацыяналісты [12]. Дзеячы "Нашай нівы" ў тых складаных умовах працягвалі працу, накіраваную на нацыянальна-культурнае адраджэнне беларусаў, за іх роўнасць з іншымі народамі. Важным аспектам у дзейнасці газеты было раскрыццё сутнасці "тутэйшых патрыётаў" і "нацыяналістаў" кампаніі Скрынчанкі, Кавалюка, Саланевіча. Вакол газеты фарміравалася беларуская інтэлігенцыя. "Усе болей і болей народу падае голас, што яны беларусы, — пісала газета, — абуджаецца ад сну вёска і мястэчка, вырастае новая, нацыянальна-свядомая беларуская інтэлігенцыя. Справа беларускага адраджэння — гэта работа не малой жмені людзей, а вялікая ўсенародная справа і ўжо зусім аб беларусах маўчаць, "не бачыць" іх — нельга" [13].

"Наша ніва" сістэматычна змяшчала матэрыялы, накіраваныя на пераадоленне рэлігійнага падзелу беларускага народа, выступала за ўвядзенне беларускай мовы ў богаслужэнне і выкладанне Закона Божага [14].

Уступленне Расіі ў вайну прывяло да ўсплёску шавіністычных настрояў у самой краіне. На кароткі тэрмін былі забыты палітычныя рознагалоссі. Правыя, акцябрысты і прагрэсісты ўключыліся ў антыгерманскую кааліцыю. 26 ліпеня ад імя партыі кадэтаў заявіў аб поўнай рашучасці падтрымаць урад П. Н. Мілюкоў. Толькі сацыял-дэмакратычныя фракцыі выступілі з заявай, у якой падкрэслівалася, што адказнасць за распачатую вайну нясуць урадавыя колы ўсіх краін, і заклікалі да міжнароднай салідарнасці працоўных. Але хутка меншавікі перайшлі на абарончыя пазіцыі, а бальшавіцкая фракцыя была саслана ў Сібір. З сацыялістаў у Думе засталіся меншавікі на чале з Чхеідзе і трудавікі, якіх узначальваў А. Ф. Керанскі.

Ваенныя паражэнні вясны—лета 1915 г. прывялі да рэзкай змены палітычнай сітуацыі. 19 ліпеня 1915 г. у Думе быў створаны "Прагрэсіўны блок". У яго ўвайшлі восем фракцый, галоўныя з іх — кадэты, прагрэсісты, левыя акцябрысты. Усяго 300 дэпутатаў з 442. Галоўнымі патрабаваннямі блока былі: стварэнне "Міністэрства даверу", адказнага перад Думай, частковая палітычная амністыя, увядзенне валаснога земства, аднаўленне прафсаюзаў, формула "аб уступленні на шлях адмены абмежавальных законаў для яўрэяў". З гэтай праграмай пагадзіліся нават правыя. Пярэчанні з іх боку выклікала толькі апошняя "формула", але ўрэшце і яны заўважылі, што "кіруючае яўрэйства ў 1914 г. зрабіла стаўку на "патрыятызм". "Увесь рускі друк (а ён на тры чвэрці быў яўрэйскі) патрабаваў вайны да пераможнага канца", — успамінаў пазней В. В. Шульгін [15]. Ён сам, былы лідэр крайне правых, увайшоў у Прагрэсіўны блок, які з агідай называў "Жоўты блок". Для В. В. Шульгіна ўвесь сэнс стварэння блока быў у тым, каб супакоіць масы, папярэдзіць рэвалюцыю і тым самым даць уладзе магчымасць давесці вайну да канца".

Такім чынам, пачынаючы з 1913 г. кадэты і прагрэсісты імкнуліся аб'яднаць апазіцыю з тым, каб прымусіць урад прыступіць да рэформ. Але цару і ўраду не патрэбна была парламенцкая, прававая Расія. Яны хацелі "паставіць на месца" ці наогул ліквідаваць Дзяржаўную думу.

Распачатая першая сусветная вайна садзейнічала яднанню пазіцый разнародных палітычных сіл, росту прыхільнікаў парламенцкага шляху для Расіі. Найбольш яскрава гэта збліжэнне праявілася ва ўтварэнні і дзейнасці Прагрэсіўнага блока, у які ўвайшоў і дэпутат ад Беларусі Ф. І. Лашкейт. У заходніх губернях правы друк, у прыватнасці газеты "Виленский вестник", "Северо-западная жизнь", рэзка выступілі супраць створанага ў Думе блока, абвінавачваючы яго ў пашырэнні правоў для яўрэйскага насельніцтва.

Між тым канфрантацыя з самадзяржаўем Прагрэсіўнага блока выклікала сімпатыі самых шырокіх пластоў грамадства.

Такім чынам, вынікі выбараў у IV Дзяржаўную думу ў 5 заходніх губернях практычна не адрозніваліся ад трэцядумскіх. 30 з 36 дэпутатаў увайшлі ў Думе ў фракцыю правых, памяркоўна-правых, рускіх нацыяналістаў і "Саюза 17 кастрычніка". 5 стварылі Польска-літоўска-беларускую групу і адзін увайшоў у фракцыю прагрэсістаў. Ніхто з левых кандыдатаў у Думу не трапіў.

Лёс расійскага парламентарызму вырашаўся не толькі ў самой Думе. Шмат што залежала ад тактычных установак палітычных партый, іх практычнай дзейнасці, рэакцыі грамадства на тое, што адбывалася ў Думе і вакол яе, палітыкі самадзяржаўя. У канцы 1912 г. урад знаходзіўся ў складаным унутрыпалітычным і міжнародным становішчы. Прадстаўнікі фракцыі правых абвінавачвалі яго за адсутнасць праграмы дзеянняў, падкрэслівалі, што шлях думскага і канстытуцыйнага развіцця прывядзе да гібелі манархіі. Дэпутаты Г. Г. Замыслоўскі (Віленская губ.), К. М. Акаловіч (Мінская губ.) і іншыя заклікалі ўрад да рашучых дзеянняў супраць палякаў і яўрэяў у заходнім краі.

Нават акцябрысты, якія настройваліся на пазітыўнае ўзаемадзеянне з уладамі для вырашэння надзённых праблем, загаварылі ў Думе аб адсутнасці іх аўтарытэту. Кадэты па-ранейшаму разглядалі Думу як фактар ціску на ўрад.

Ніхто з нацыянальна свядомых беларусаў у IV Думу не трапіў. Адзіным дэпутатам ад беларускіх губерняў, на якога ўскладалі надзеі сялянскія выбаршчыкі, быў селянін са Случчыны С. Ф. Вярбіла (у зямельнай справе лічыў сябе трудавіком).

Першая сусветная вайна садзейнічала збліжэнню пазіцый разнародных палітычных сіл, росту прыхільнікаў парламенцкага шляху для Расіі (у Прагрэсіўны блок увайшоў і дэпутат ад Беларусі Ф. І. Лашкейт). Па-ранейшаму ўскладала надзеі на Думу рэдакцыя газеты "Наша ніва".

## Summary

The results of the elections to the State Duma of Russia from Belarus are shown in the article. Class and political structure of the deputies is analyzed. The relation of Duma deputies from the west provinces and from the local press toward the policy of the government and basic questions of political life of the country are viewed.

## Літаратура

1. Боиович М. М. Члены Государственной думы (портреты и биографии). Четвертый созыв (1912—1917). М., 1913.

2. Аврех А. Я. Царизм и IV Дума. М., 1981. С. 25—26.

3. Бестужев И. Б. Борьба в России по вопросам внешней политики накануне первой мировой войны (1910—1914 г.) // Истор. записки. М., 1965. Т. 75. С. 61—69.

4. Государственная дума. Стенографические отчеты. IV созыв. Сессия I. Ч. I.

5. Виленский вестник. 1912. 2 апр.

6. Сьезд прогрессистов 11—13 ноября 1912 г. Спб., 1913. С. 4, 5, 9—13.

7. Утро России. 1913. 17 марта.

8. Речь. 1912. 6 дек.

9. Речь. 1912. 8 дек.

10. Северо-западная жизнь. 1912. 25 окт. № 266.

11. Наша ніва. 1913. 18 студз.

12. Наша ніва. 1912. 19 ліп.

13. Наша ніва. 1912. 5 ліп.

14. Вечерняя газета. 1913. 19 янв.

15. Шульгин В. Годы — дни — 1920. М., 1990. С. 96.

*Інстытут гісторыі*
*НАН Беларусі*

*Паступіў у рэдакцыю*
*25.03.87*